УДК [75.041+75.047]:75.021(476)Шчамялёў

# ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ Ў ЖЫВАПІСЕ Л. Д. ШЧАМЯЛЁВА: ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

***А. В. Пагоцкая,*** *кандыдат мастацтвазнаўства,*
*дэкан факультэта мастацкай культуры ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя**. Артыкул прысвечаны даследаванню творчасці вядомага жывапісца, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў, народнага мастака БССР Леаніда Дзмітрыевіча Шчамялёва. Яго творчасць стала важным унёскам у скарбніцу беларускага нацыянальнага выяўленчага мастацтва. Мастак працаваў у розных жанрах і стварыў цэлую эпоху ў беларускім жывапісе. Яго манера пазнавальная, своеасаблівая, але трымаецца на класічнай аснове беларускага выяўленчага мастацтва.

**Ключавыя словы:** Л. Д. Шчамялёў, акадэмічны жывапіс, беларускае мастацтва, выстава, выяўленчае мастацтва, жанр, малюнак, мастак.

# TRADITIONS AND INNOVATIONS IN L. SHCHEMELEV'S PAINTING: TO THE 100TH ANNIVERSARY OF HIS BIRTH

***A. Pahotskaya,*** *PhD in Art History, Dean of the Faculty of Art Culture of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article is devoted to the study of the work of the famous painter, teacher, Honored Artist Leonid Shchemelev. His work has become an important contribution to the treasury of the Belarusian National Fine Art. The artist worked in different genres and created an entire era in Belarusian painting. His manner is informative, peculiar, but it is based on the classical basis of Belarusian fine art.

**Keywords:** academic painting, Belarusian art, exhibition, genre, fine art, drawing, artist, painter.

Літаральна два гады не дажыў Леанід Шчамялёў да свайго 100-гадовага юбілею. Яшчэ пры жыцці мастак стаў класікам беларускага жывапісу і бясспрэчным лідэрам беларускай культуры, адным з буйнейшых майстроў, які праз усё жыццё пранёс сваю творчую, грамадзянскую, чалавечую пазіцыю Майстра, свабоднага і незалежнага ад абставінаў, непадуладнага часу.



Леанід Шчамялёў у 2017 г. (фота з асабістага архіва мастака, упершыню надрукавана ў [5])

Традыцыі класічнага жывапісу Л. Шчамялёў спазнаў яшчэ да таго, як атрымаў акадэмічную адукацыю. З дзяцінства ён пастаянна маляваў, збіраў рэпрадукцыі карцін вядомых класікаў, хадзіў на выставы, бываў у майстэрні Юдаля Пэна [4, с. 18]. Але сапраўдная вучоба пачалася толькі ў пасляваенны час. Спачатку вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы ў Льва Лейтмана, далей – у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце ў мастака Віталя Цвіркі. Навучанне ў Віталя Канстанцінавіча дало мастаку шмат карыснага ў плане аднаўлення беларускасці ў светаўяўленні і творчасці, асабліва ў галіне колеравай пластыкі, адчування беларускага колеравага ландшафту ва ўсіх яго пластычных выяўленнях. Пасля Л. Шчамялёў сам стаў выкладчыкам: у Мінскім мастацкім вучылішчы, Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і

выяўленчым мастацтве, на архітэктурным факультэце Беларускага палітэхнічнага інстытута.

Выхаваны на традыцыях класічнага жывапісу, творца ўсё ж такі неаднаразова атрымліваў крытычныя заўвагі за фармалізм. Пачынаючы з самай ранняй работы – дыпломнай карціны «Вяселле» (1959), якая не выстаўлялася да 2007 г. і ўпершыню з'явілася перад гледачамі на персанальнай выставе Л. Шчамялёва «Мастак і час» у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Але жывапісец прытрымліваўся думкі, што твор заўсёды павінен несці дабрыню. Ён мог адысці ад прынятых канонаў будовы кампазіцыі, ад стандартных памераў палатна і колеравай гамы. І ўсё ж работы Л. Шчамялёва прыцягваюць увагу тым, што ён, не адыходзячы ад уласнага меркавання, заўсёды адлюстроўваў асабісты погляд на сітуацыю. Галоўнай для мастака была ўнутраная свабода. Сэнсам яго жыцця стала штодзённая праца ў майстэрні.

Леанід Дзмітрыевіч належаў да пакалення мастакоў-«шасцідзясятнікаў» і адным з першых унёс значны ўклад у найноўшае савецкае мастацтва т. зв. «суровага стылю» [4, с. 14]. Як заўважаюць даследчыкі: «…Экспазіцыя выставы светлая, але творы брутальныя паводле зместу і стылістыкі» [1, с. 38]. Мастацтвазнаўцы адзначаюць, што творы майстра вылучаюцца свабоднай манерай, выкарыстаннем святлоценявых дынамічных эфектаў, адсутнасцю дэталізацыі, экспрэсіўнасцю, а партрэты – псіхалагічнай глыбінёй і шчодрасцю характарыстык.

Жывапіс Л. Шчамялёва эмацыянальны, напоўнены пачуццямі: у яго творах і каханне, і смутак, і настальгія па дзяцінству і маладосці, і па старых гарадах. Яго працы вылучаюцца светлымі фарбамі, спакойнае раўнамернае святло запаўняе прастору яго карцін. Кожны твор выразны і мае асаблівы настрой. Майстар праслаўляў Беларусь, захапляўся яе краявідамі, ствараючы ўзнёслыя, паэтычныя вобразы роднай зямлі і яе жыхароў. Дзіўна, але на працягу стагоддзя мастак у творчасці заўсёды заставаўся самім сабой, прытрымліваўся духоўных прынцыпаў у адносінах да мастацтва, чалавека, прыроды і гісторыі, асабліва ў партрэтах і сюжэтных карцінах, прысвечаных сям'і – жонцы, дзецям і ўнукам, а таксама сябрам [3, с. 295].

Тэма Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху на Беларусі стала адной з галоўных у яго творчасці. Ён прайшоў усю вайну: удзельнічаў у Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі, быў цяжка паранены пад Мазыром, ваяваў у складзе Кубанскага казацкага корпуса, быў узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.». Драматычныя падзеі вайны паўплывалі на яго творчасць, вызначылі стылявыя характарыстыкі і сэнсавую напоўненасць жывапісу. Тым не менш класічных батальных сцэн ў яго творах няма, яны яго мала цікавілі [4, с. 20]. Майстру была важная атмасфера вайны – таму з'явіліся псіхалагічныя сюжэты пра тое, што

здараецца з чалавекам на вайне, калі, рызыкуючы жыццём, ён ідзе абараняць Радзіму, пераадольваючы страх, боль, жах, пакуты, смерць. Такія яго карціны «Маё нараджэнне» (1976), «Трывожнае лета 1941 года» (1986), «Першы дзень міру» (1981) і інш.

Творы Л. Шчамялёва вядомы за мяжой, іх набылі буйныя галерэі і музеі. Яго карціны знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве, у фондах Беларускага саюза мастакоў, ва ўсіх абласных краязнаўчых музеях Беларусі і інш. У Мінску ў 2003 г. была адкрыта Гарадская мастацкая галерэя твораў (зараз – галерэя мастацтваў) Л. Шчамялёва. Яна размешчана ў гістарычным цэнтры Мінска – на тэрыторыі Верхняга горада – у будынку – помніку архітэктуры XIX ст. У пастаяннай экспазіцыі прадстаўлена больш за 60 жывапісных твораў мастака. Наведвальнікі галерэі знаёмяцца з усімі жанрамі жывапісу, у якіх працаваў майстар, могуць ацаніць яго яркую палітру, адчуць непаўторны стыль аўтара. Акрамя пастаяннай экспазіцыі ў галерэі працуюць зменныя тэматычныя выставы, напрыклад, яго вучняўмастакоў. Леанід Дзмітрыевіч быў не толькі выбітным мастаком, але і вялікім настаўнікам [2].

Мастацтвазнаўца і журналіст, сябра і паплечнік Л. Шчамялёва з 1965 г. Барыс Крэпак прысвяціў творчасці мастака артыкулы, эсэ, у т. л. кнігу «Леонид Щемелев. Краски и ритмы времени» з серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», дзе распавядае пра невядомыя факты жыцця мастака і яго непаўторны творчы лёс [3].

Леанід Дзмітрыевіч за сваю плённую працу атрымаў шэраг узнагарод і ўсеагульнае прызнанне: Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1977), Народны мастак БССР (1983). За цыкл карцін «Край мой Міншчына» атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР (1982). Узнагароджаны бронзавым медалём ВДНГ СССР (1969, за карціну «Мацярынства»), сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1975, за карціну «Генерал Даватар»), медалём Беларускага саюза мастакоў «За заслугі ў выяўленчым мастацтве» (1998), дзяржаўнай узнагародай «Медаль Ф. Скарыны» (1993) і «Ордэн Ф. Скарыны» (2001), нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2003). Ганаровы грамадзянін горада Мінска (2003). Лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы (2010) [5, с. 428]. З 2023 г. імя Л. Шчамялёва носіць вуліца ў Мінску.

Уплыў творчасці Л. Шчамялёва на жывапісную культуру Беларусі другой паловы XX ст. велізарны, а яго жыццёвы шлях мастака і грамадзяніна – высокі прыклад творчага даўгалецця, духоўнай сталасці і жыццёвай мудрасці.

1. *Васілеўскі, П.* Леанід Шчамялёў. Наіўны і мудры / П. Васілеўскі // Мастацтва. – 2023. – № 3(480). – С. 38–39.

2. Галерея искусств Леонида Щемелева. – Режим доступа: http://shchemelev-gallery.museum.by. – Дата доступа: 01.04.2023.

3. *Крепак, Б. А.* Леонид Щемелев. Краски и ритмы времени / Б. А. Крепак. – Минск : Маст. літ., 2005. – 303 с. – (Жизнь знаменитых людей Беларуси).

4. *Крэпак, Б.* Два вялікія жыццi, дзве споведзі – праз дарогі эпохі… / Б. Крэпак // Мастацтва. – 2023. – № 1(478). – С. 14–20.

5. *Пагоцкая, Е. В.* Щемелев Леонид Дмитриевич / Е. В. Пагоцкая // Современное искусство Республики Беларусь : справ. персоналий / сост.: В. П. Прокопцова [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2018. – С. 428.